Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя В. І. Леніна

№ 7 (249) | Пятніца, 2 сакавіка 1956 года. | Цана 20 кап.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Творча развіваць марксісцка - ленінскую тэорыю. — (1 стар.).

Па універсітэту. — (1 стар.).

Ю. Свірко.—У нас не усё яшчэ добра.—(1 стар.).

Будні хімічнага факультэта—(2 стар.).

Адказныя задачы. (З пасед-жання Вучонага совета).—(3 стар.).

Павысіць дысцыпліну на лекцыях.—(3 стар.).

Універсітэцкі Вожык. — (3 стар.).

Графік абмену комсамольскіх дакументаў. — (4 стар.).

Фізкультура і спорт. — (4 стар.).

# ТВОРЧА РАЗВІВАЦЬ МАРКСІСЦКА—ЛЕНІНСКУЮ ТЭОРЫЮ

З вялікім задавальненнем сустрэлі працоўныя нашай Радзімы рашэнні XX з'езда КПСС. Яны увойдуць у гісторыю, як падзеі вялікага сусветнага значэння. Гэтыя рашэнні раскрываюць перад совецкім народам грандыёзную праграму барацьбы за пабудову комуністычнага грамадства, за умацаванне міру ва усім свеце, за перамогу вялікіх марксісцка-ленінскіх ідэй.

У справаздачным дакладзе Цэнтральнага Камітэта КПСС дадзен глыбокі марксісцка-ленінскі аналіз сучаснага міжнароднага становішча, суадносін сіл соцыялістычнага лагеру і капіталістычнага на міжнароднай арэне. Галоўнай рысай нашай эпохі з'яўляецца выхад соцыялізма за рамкі адной краіны і ператварэнне яго ў сусветную сістэму. У процілегласць краінам капіталістычнага свету, краіны соцыялістычнага лагеру паспяхова развіваюць сваю эканоміку і культуру на аснове роўнаправнага супрацоўніцтва і брацкай узаемадапамогі. Капіталізм аказаўся бяссільным перашкодзіць гэтаму сусветна-гістарычнаму працэсу; буржуазія самым аб'ектыўным ходам развіцця гісторыі вымушана прызнаць перавагу новай, соцыялістычнай сістэмы, няспыннае ўмацаванне яго магутнасці і сілы у шкоду капіталізма. На нашых вачах са здзіўляючай хуткасцю рушыцца каланіяльная сістэма імперыялізма. Вякамі прыгнечаныя масы каланіяльна-залежных краін самастойна выходзяць на арэну гістарычнай дзейнасці, магутны нацыянальна-вызваленчы рух з кожным днём набліжае крах каланіялізма.

Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта увойдзе у гісторыю нашай партыі, як узор творчага падыходу да развіцця марксісцка-ленінскай навукі. Вывады аб мірным суіснаванні двух сістэм, аб магчымасці папярэджання вайны ў сучасную эпоху, аб формах пераходу розных краін да соцыялізма глыбока адлюстроўваюць сучасны гістарычны вопыт і уяўляюць сабой далейшае развіццё марксісцка-ленінскай тэорыі.

У справаздачным дакладзе ЦК XX з'езду КПСС яшчэ раз атрымалі свае адлюстраванне пытанні марксісцка-ленінскай эканамічнай навукі. У рашэннях з'езда атрымала далейшае асвятленне пытанне аб ролі асобы ў гісторыі. З'езд адобрыў дзейнасць Цэнтральнага Камітэта, узброенага супраць культа асобы, распаўсюджанне якога зніжае ролю партыі і народных мас, прыводзіць да прыніжэння ролі калектыўнага кіраўніцтва ў партыі і парушэнню норм унутрыпартыйнай дэмакратыі.

Вялікую увагу удзяліў з'езд пытанням нашай нацыянальнай палітыкі, нацэліўшы партыю на пашырэнне праваў саюзных рэспублік і адмовы ад дробязнай апекі у адносінах да іх. Гэта яшчэ больш садзейнічае росту эканомікі і умацаванню асабістага суверэнітэту саюзных рэспублік, узаемнага давер'я паміж імі і дружбы народаў СССР.

Адзначыўшы далейшае умацаванне совецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, XX з'езд КПСС указаў на неабходнасць яшчэ большага умацавання саюза рабочага класа і калгаснага сялянства, іх брацкага супрацоўніцтва у пабудове комуністычнага грамадства.

Адначасова з'езд паставіў задачу па умацаванню ідэалагічнай работы партыі. Неабходна хутчэй пераадоліць адрыў прапаганды ад практыкі комуністычнага будаўніцтва, ліквідаваць чужы творчаму духу марксізма-ленінізма дагматызм і начотніцтва, бо гэта непазбежна уносіць блытаніну у пытанні тэорыі і прыводзіць да адступлення ад генеральнай лініі партыі.

Рашэнні XX з'езда КПСС адкрываюць новыя бязмежныя магчымасці для нашых навуковых работнікаў. Абавязак нашых вучоных, перш за усё, гісторыкаў-эканамістаў і філосафаў, работнікаў ідэалагічнага фронту творча падыходзіць да пытанняў вывучэння марксізма-ленінізма, пакончыць з заганнай практыкай дагматызма і начотніцтва, усямерна развіваць марксісцка-ленінскую тэорыю на аснове канкрэтнага вывучэння і абагульнення сучаснага гістарычнага вопыту. Лекцыі нашых вучоных па палітэканоміі, філасофіі і гісторыі павінны стаць сапраўдным цэнтрам ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў. Выкладанне тэарэтычнага матэрыялу павінна грунтавацца на канкрэтных фактах і прыкладах, узятых з жыцця, што дае магчымасць зрабіць іх цікавымі і даступнымі разуменню студэнтаў. Неабходна узмацніць работу па стварэнню асобных навуковых прац, манаграфій па пытаннях марксісцка-ленінскай палітэканоміі, філасофіі, гісторыі і літаратуры, часцей прыбягаць да стэнаграфавання лекцый і выдання асобных брашур па пытаннях марксізма-ленінізма у дапамогу студэнтам.

Рашэнні XX з'езда КПСС натхняюць працоўных Совецкага Саюза на барацьбу за новыя поспехі і прагрэс нашай краіны. Разам з усім совецкім народам вялікі і працалюбівы калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна унясе свой дастойны уклад у імя перамогі той вялікай справы, якой прысвечана уся дзейнасць нашай партыі, створанай і выхаванай неўміручым Леніным.

## XXI навуковая сесія

З 24 па 29 лютага у БДУ праходзіла XXI навуковая сесія, прысвечаная вынікам навукова-даследчай работы за 1955 год. У ёй прымалі удзел навуковыя работнікі, аспіранты і студэнты універсітэта, прадстаўнікі другіх навучальных устаноў і прадпрыемстваў.

На сесіі было прачытана 107 дакладаў: 100 на секцыйных і 7 на пленарных пасяджэннях.

Найбольш актыўна секцыйныя пасяджэнні прайшлі на біёлага-глебавым, фізіка-матэматычным, хімічным і гістарычным факультэтах.

# ПА УНІВЕРСІТЭТУ

★ ★ ★

## У СТУДЭНЦКІХ НОВУКОВЫХ ГУРТКАХ

### ГУРТОК ДАРВІНІЗМА І ГЕНЕТЫКІ

З першых дзён заняткаў гурток наведваюць 13 студэнтаў. Кіруе ім дацэнт А. І. Палілаў Толькі за 1 семестр было 8 пасяджэнняў гуртка, на пяці з іх заслуханы даклады навуковых супрацоўнікаў АН БССР. Студэнты абмеркавалі тры рэфератыўных і тры даследчых даклады (курсавыя работы студэнтак Беражной, Ракуць, Аляхновіч, Івашкевіч).

Работа Беражной, Аляхновіч і Івашкевіч рэкамендаваны на агляд студэнцкіх работ.

### ГУРТОК ГЛЕБАЗНАЎСТВА

Гурток глебазнаўства—самы вялікі гурток на факультэце. Рэгулярна яго наведвае 60 чалавек. На трох пасяджэннях прачытаны былі два даследчых (студ. Б. Якушэвіч (V курс) і Дуброўскай (IV курс) і два рэфератыўных даклады. На адным з пасяджэнняў быў праслуханы даклад кандыдата геалагічных навук, дацэнта П. С. Самадурава «Тэахімічная сутнасць лесастварэнняў».

### ГУРТОК ФІЗІЯЛОГІІ РАСЛІН

У гуртку займаецца 14 чалавек, кіруе ім прафесар Т. Н. Годнеў. Шэсць пасяджэнняў, якія былі праведзены у першым семестры, прайшлі цікава. На адным з іх прафесар Т. Н. Годнеў расказаў аб канферэнцыі у Жэневе па мірнаму выкарыстанню атамнай энергіі

Цікавыя даклады зроблены студэнткамі Хадарэнка, Ліпскай і Цанаевай.

На пасяджэннях гуртка праведзен агляд артыкулаў, змешчаных у часопісах. Актыўна працуюць гурткоўцы Андросік, Пытлякова, Харытонава, Дзянісава.

### ГУРТОК СІСТЭМАТЫКІ РАСЛІН

Не менш цікава праходзяць пасяджэнні і у гэтым гуртку. Ім кіруе дацэнт Н. О. Петтэрман. 10 студэнтаў з 28, якія працуюць у гуртку, другакурснікі. На пяці пасяджэннях, з васьмі адбыўшыхся, было праслухана пяць дакладаў—даследчых і рэфератыўных.

Асабліва цікава прайшло пасяджэнне, на якім былі заслуханы паведамленні студэнтак V курса Чарняўскай і Сокалавай аб падарожжы на Каўказ. Паведамленне суправаджалася дэманстрацыяй сабраных матэрыялаў.

На гуртку былі абмеркаваны курсавыя работы студэнтаў Бесман (III курс), Карнажыцкай (IV курс), Гапоненка (III курс).

**«НАВУКОВЫ БЮЛЕТЭНЬ» № 4 біёлага-глабавага факультэта.**

### НА АДНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

Цікава праходзяць заняткі на геолага-геаграфічным факультэце у гуртку фізічнай геаграфіі, які ўзначальвае кандыдат геаграфічных навук О. Ф. Якушка. У рабоце гуртка прымаюць актыўны удзел студэнты не толькі другога і трэцяга курсаў, але і першакурснікі.

Днямі адбылося чарговае пасяджэнне гуртка. З дакладам аб падарожжы па высакагорных абласцях Паміра і Тянь-Шаня выступіў удзельнік экспедыцыі лаўрэат Сталінскай прэміі Васілій Міхайлавіч Трушнікаў. Ён прымаў удзел і у здыманні гор. Свае здымкі ён прадэманстраваў праз спецыяльны прыбор перад удзельнікамі гуртка. Падрабязна ён спыніўся на характарыстыцы прыродных умоў Паміра і Тянь-Шаня, расказаў, якія цяжкасці сустракалі совецкія тапографы ў час здымання цяжкадаступных мясцовасцей, якія доўгі час заставаліся белай плямай на усіх картах.

Сустрэчы гурткоўцаў з удзельнікамі экспедыцый праводзяцца часта, на пасяджэннях гурткоў абмяркоўваюцца курсавыя і навуковыя работы студэнтаў-гурткоўцаў.

**В. БОЛДЫШАЎ,**
**студэнт 1 курса геафака.**

## У аспірантаў біяфака

Аспірантка трэцяга года навучання Н. Дунке поўнасцю ўжо закончыла збор матэрыялаў, патрэбных для напісання навуковай працы. Зараз яна праводзіць сістэматызацыю матэрыялаў, прыступіла да напісання дысертацыі. Тэма яе—«Падрабіялагічныя умовы вырошчвання малькоў каштоўных рыб пры промыславым рыбаразвядзенні у БССР». Яна будзе мець вялікае практычнае значэнне для павышэння прадуктыўнасці вадаёмаў.

Старанна працуе над работай «Колькасная залежнасць бактэрый ад тыпу вадаёма» аспірантка другога года навучання Ю. С. Бяляцкая.

Навуковы супрацоўнік біялагічнай станцыі возера Нарач П. С. Невядомская распрацоўвае важную тэму: «Біялогія асноўных бентасаядных рыб азёр Нарачанскай групы».

Там, на станцыі, круглы год пад кіраўніцтвам прафесара Г. Г. Вінберга вядуцца назіранні за рыбамі.

Нядрэнна распрацоўваюць свае тэмы аспіранты Л. Сушчэня, студэнт Б. Чэчуга і іншыя.

**І. СІПАКОЎ.**

## У НАС ЯШЧЭ НЕ ЎСЁ ДОБРА

21 лютага адбыўся комсамольскі сход студэнтаў II курса аддзялення журналістыкі. Старшы выкладчык С. Л. Дорскі падвёў вынікі зімняй экзаменацыйнай сесіі, адзначыў, што II курс аддзялення журналістыкі паспяхова вытрымаў экзамены. Большасць студэнтаў пры адказах паказала глыбокія веды. 19 чалавек здалі сесію на «выдатна». Толькі адна студэнтка Д. Пераверзева мае нездавальняючую адзнаку па зарубежнай літаратуры. С. Л. Дорскі адзначыў, што ўжо з першых дзён новага семестра заўважаюцца парушэнні дысцыпліны .Многія студэнты не выйшлі на расчыстку снегу, паўтараюцца пропускі лекцый.

Надзвычай многа гаварылася на сходзе аб парушэнні дысцыпліны, аб паляпшэнні работы курсавога бюро.

Член комсамольскага бюро аддз. журналістыкі Т. Карцава спынілася на усіх недахопах нашага курса. Яна вельмі востра, сапраўды па-комсамольску крытыкавала курсавое бюро, якое толькі абмяркоўвае недахопы курса, але не прымае канкрэтных мер да іх выпраўлення.

Тав. Карцава указала на адарванасць работы комсорга і прафорга ад курсавога бюро. Яна адзначыла, што нельга мірыцца з тым, што нярэдка на лекцыях па асновах марксізма-ленінізма з усяго факультэта прысутнічае трэцяя частка студэнтаў. Вельмі часта прапускаюць лекцыі Э. Дамарацкі, Н. Гілевіч, М. Стральцоў і іншыя, але на іх ніхто не звяртае увагі.

Б. Фралоў і В. Чэпікаў у сваіх выступленнях гаварылі аб запушчанасці на курсе культурна-масавай работы.

Дацэнт Д. Е. Фактаровіч звярнуў увагу на тое, што у многіх студэнтаў не адчуваецца прагі да навукі. Ён параіў студэнтам узяць на улік кожны дзень, кожную гадзіну, не цурацца практыкі у шматтыражцы БДУ і насценным друку.

Дэкан філалагічнага факультэта М. Г. Ларчанка у сваім выступленні гаварыў аб неабходнасці сістэматычнага наведвання лекцый. Кожная лекцыя дае неабходнае для студэнта, паглыбляе яго веды.

Трэба адзначыць, што комсамольскі сход прайшоў вельмі актыўна. Выступала многа студэнтаў, якія ускрылі недахопы на курсе і унеслі каштоўныя прапановы.

Сход прыняў рашэнне весці строгі кантроль прысутнасці студэнтаў на лекцыях, аказаць дапамогу адстаючым студэнтам.

**Ю. СВІРКО.**

### НА КОМСАМОЛЬСКІМ БЮРО

Днямі адбылося пасяджэнне комсамольскага бюро аддзялення журналістыкі, дзе былі абмеркаваны тэмы дакладаў для членаў гуртка журналістыкі.

Студэнтка Т. Арлова рыхтуе даклад на тэму: «Тэатральная рэцэнзія у маладзёжнай газеце», Ф. Савіцкі — «Артыкулы В. І. Леніна у газеце «Вперёд», Т. Булгакова—«Сатырычныя журналы 1905—1907 гг.».

# БУДНІ ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

(РЭПАРТАЖ)

## Падойдзем да насценгазеты

Чым жывуць сёння студэнты хімфака? Што іх хвалюе? Якія планы на будучае?

Звернемся спачатку да насценнай газеты «Савецкі хімік». Яна павінна даць нам першыя адказы, пазнаёміць з жыццём калектыва.

Падымаемся на другі паверх. Толькі што прагучэў званок на перапынак. Каля «Савецкага хіміка» стаіць ужо невялікая група студэнтаў..., падыходзяць другія. Зразумела—сёння новы нумар.

З вынікамі зімовай сесіі выступае ў газеце дэкан факультэта І. Г. Цішчанка. Прыемна было прачытаць, што амаль палавіна студэнтаў (49 працэнтаў) хімфака здала сесію на «выдатна». Тут-жа знаёмімся з лепшымі: Гарошка і Рэут, Альшэўскай і Пшанічным, Хацько і Янкоўскай Арыка і Яхніч, Некрасавай і Неакладнавай.

А вось і сатырычны аддзел «Хромавая сумесь», які заўсёды прыцягвае вялікую ўвагу чытачоў.

Але сёння «Хромавая сумесь» міласлівая. Яна не закранае асобных студэнтаў, гаворыць увогуле. 16 чалавек III курса спазніліся на заняткі... Да газеты падыходзіць адзін з гэтых 16 студэнтаў, чытае... і, як ні ў чым не бывала, адыходзіць. Хіба-ж гэта яго датычыцца: на малюнку не падобен, прозвішча і імя не падпісаны. Не, гэта не ён! І з усіх малюнкаў толькі адзін прама называе парушальнікаў дысцыпліны — студэнтак IV курса Зубровіч і Рудакоўскую.

Адбылося наша першае знаёмства з факультэтам. Цяпер мы ведаем лепшых, ведаем і парушальнікаў, ведаем пра справы прайшоўшага семестра і пра планы на будучае. Можна і бліжэй пазнаёміцца з жыццём факультэта.

## Пагутарым аб СНТ

Старшыня СНТ хімічнага факультэта Г. Быліна расказаў нам пра навукова-даследчую работу студэнтаў-хімікаў.

— На нашым факультэце, — пачаў юнак.—працуюць пяць навукова-даследчых гурткоў, у якіх займаюцца 50 студэнтаў I—IV курсаў. Тэмы, якія распрацоўваюцца членамі таварыства, самыя разнастайныя. У гуртку арганічнай хіміі студэнтка IV курса Т. Шут вывучае якасці трыфторвоцатнай кіслаты і сінтэзы на яе аснове. Актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце прымаюць першакурснікі Так, над важнай тэмай працуе Е. Самускевіч—«Палярызацыя іёнаў і яе значэнне ў хіміі», Браніцкі—над тэмай «Хімічныя асновы фатаграфіі».

— Скажыце, спрыяльныя у вас умовы для даследаванняў? Няма перабояў у рабоце таварыства?— звяртаемся мы да субяседніка з запытаннем.

— Трэба адзначыць, што недахопы ў нас яшчэ ёсць. Так, работа пачалася ў гэтым годзе са спазненнем, з сярэдзіны першага семестра. Перыяд раскачкі быў вялікі. У гэтым вінаваты Совет СНТ, прафсаюзная і комсамольская арганізацыі, а таксама кафедры, якія позна пазнаёмілі гуртκоўцаў з тэмамі даследчых работ.

Мы пацікавіліся справамі таварыства ў сучасны момант. Аказалася, што сур'ёзным недахопам і тормазам для навукова-даследчай работы студэнтаў з'яўляецца адсутнасць кабінета хіміі. Даклады чытаюцца на канферэнцыях і затым назаўсёды забываюцца, валяюцца за адсутнасцю кабінета дзе-небудзь на сталах лабараторый. Апрача таго, кабінет неабходзен для скаплення даведчай літаратуры, што таксама дапамагло-б у рабоце. Студэнты ўжо некалькі разоў ставілі гэтае пытанне перад дэканатам, аднак дагэтуль не прыняты ніякія меры.

## Усюды першыя

У аудыторыях ідуць лекцыі, у лабараторыях і кабінетах—практычныя заняткі, эксперыментальныя даследаванні, работа над гуртковымі і дыпломнымі работамі.

Знаёмімся з выдатнікамі хімічнага факультэта.

— Пакроўскі? Ён працуе у лабараторыі арганічнай хіміі,—адказаў комсорг III курса Георгій Самаль, калі яго запыталі, дзе знайсці яго аднакурсніка Ігара Пакроўскага.

Апошні выконваў чарговую лабараторную работу па арганічнай хіміі.

— Заняткі па арганізацыі ў гэтым семестры ў нас пачаліся нядаўна—амаль ніякіх поспехаў,— гаворыць Ігар, выходзячы насустрач. Але больш красамоўна аб яго поспехах гавораць выдатныя адзнакі ў яго заліковай кніжцы і вынікі яго гуртковых заняткаў. Ігар любіць спорт і займаецца ў секцыі лёгкай атлетыкі, увесь час паляпшаючы свае спартыўныя паказчыкі. Нядаўна яго ўвялі ў рэдкалегію насценгазеты «Спорт».

— Ён паспявае ўсюды,—гавораць таварышы Ігара. Аднакурснікі любяць і паважаюць Пакроўскага і як здольнага, старраннага студэнта, і як чулага і шчырага таварыша.

Адказны перыяд цяпер у Міхаіла Гілевіча. Ён рыхтуе дыпломную работу на тэму «Спектр паглынання фарбавальнікаў».

У 1951 годзе Міхаіл паступіў у БДУ на хімічны факультэт. З першых-жа дзён вучобы гэты здольны юнак праявіў надзвычайную ўвагу і настойлівасць у вучобе, прымаў актыўны ўдзел у грамадскай дзейнасці. Студэнты выбралі яго старшынёй профбюро хімфака.

Першую сесію Міхаіл здаў на «выдатна», і гэтая радасць, радасць першага поспеху яшчэ прыбавіла энергіі. На другім курсе яму прысвойваюць стыпендыю імя 15-годдзя ВЛКСМ. Пяць год не ведаў стомленасці гэты вясёлы юнак. Не ведае ён яе і цяпер. Вось ён, не спяшаючыся, ідзе па калідоры з двума колбачкамі, да палавіны напоўненымі цёмназялёвай вадкасцю, заходзіць у лабараторыю фізічнай і калоіднай хіміі. Тут ён працуе над сваёй дыпломнай работай. Ужо закончана падрыхтоўчая работа, атрыманы пасля упорнай барацьбы з цяжкасцямі першыя вынікі.

Мы назвалі толькі некалькі прозвішчаў выдатнікаў вучобы. А колькі іх на хімфаку! Усе яны жывуць цікавым, захапляючым жыццём — выдатна вучацца, удзельнічаюць у грамадскім жыцці універсітэта, добра адпачываюць.



*Студэнткі II курса Ю. Гарнастаева і Г. Чарнякова на практычных занятках у фізічнай лабараторыі.*

*Фото Г. ПРАВАЛОВІЧА.*

## На комсамольскім сходзе

На наша пытанне, як ідуць справы у групах, сакратар комсамольскай арганізацыі хімфака А. Хацько адказала:

— На курсах праходзяць комсамольскія сходы, прысвечаныя вынікам зімовай сесіі, разглядаюцца пытанні аб дысцыпліне. Увечары сход на IV курсе. Зайдзіце, паслухайце, чым жывуць комсамольцы.

І вось мы у 21 аудыторыі, дзе сабраліся сёння чацверакурснікі. Заўтра будучыя педагогі, выхавацелі пойдуць на практыку у школы горада. І, магчыма, пагэтаму, нягледзячы, што сход прысвечан вынікам зімовай сесіі, цэнтральнае месца ў выступленнях студэнтаў займае пытанне аб дысцыпліне. А парушальнікі на курсе знайшліся. Вось Ліля Стаўская. З абурэннем гавораць аб ёй аднакурснікі. Стаўская грубіць выкладчыкам, на экзаменах проста выпрошвае «тройкі».

— Ты ганьбіш наш курс. А праз год мяркуеш стаць выкладчыкам,—з абурэннем гаварылі комсамольцы.

Нават тут, на сходзе, Стаўская трымала сябе непрыстойна, кідала з месца рэплікі студэнтам, якія па-сяброўску строга асуджалі яе паводзіны. А сябры яны, відаць, добрыя, чулыя. Добрыя ў сваёй патрабавальнасці, чулыя і ў дапамозе.

Студэнты не толькі аднагалосна аб'явілі Стаўскай вымову, але рашылі усім курсам узяць Лілю «пад кантроль».

Па-сяброўску аднесліся чацвёракурснікі і да Рудакоўскай. Іра часта хварэе. Студэнты вылучылі ёй асобны падручнік, прапанавалі дапамогу, вызвалілі ад грамадскіх даручэнняў. Толькі вучыся. Але Іра мала цэніць дружбу сваіх таварышаў. У зімовую сесію Рудакоўская атрымала па будове малекул «нездавальняюча».—Можа яна хварэла у гэты час? Можа потым нехапіла часу на падрыхтоўку?

— Не. На танцах—Іра першая. Паклапаціцца аб знешнасці яна таксама не забывае. А вось на набыццё ведаў часу не хапае. Ужо трэцюю сесію яна здае на «здавальняюча».

— Патрэбна дапамога — дапаможам. Але парушаць дысцыпліну, цягнуць курс назад—не дазволім!—строга і цвёрда заявілі комсамольцы. А слова чацверакурснікаў не разыходзіцца са справай.

## Вусны часопіс

Тры гады назад на комсамольскім сходзе першага курса хімфака Міхаіл Гурэвіч прапанаваў арганізаваць штомесячны вусны часопіс. Прапанова спадабалася аднакурснікам, яны горача падтрымалі ініцыятыву Гурэвіча. Арганізавалі часопіс з трох аддзелаў: навука, тэхніка і мастацтва. Каб часопіс быў змястоўным і цікавым, адказнымі за кожны аддзел былі падабраны найбольш падрыхтаваныя і здольныя студэнты курса. Аддзелы узначалілі Георгій Быліна, Тамара Леонава і Тамара Берэсневіч.

Гэтыя таварышы збіралі матэрыял, пільна сачылі за навінамі у навуковай і тэхнічнай літаратуры, каб потым на зборы курса расказаць таварышам аб новых дасягненнях у навуцы і тэхніцы, аб навінах у мастацтве і літаратуры. Нядаўна аддзел навукі даручылі весці студэнту Ігару Пакроўскаму.

Трэці год выдаецца вусны часопіс. Яго рэдактары і слухачы займаюцца ўжо на трэцім курсе хімфака. Значна вырасла змястоўнасць нумароў часопіса і яго папулярнасць.

## Добрыя вынікі

Надзвычай разнастайным, цікавым і захапляючым з'яўляецца спартыўнае жыццё на хімічным факультэце. Амаль усе студэнты —члены ДСТ «Буравеснік», 114 студэнтаў хімфака займаюцца у спартыўных секцыях БДУ. Спартыўныя разрады маюць каля 50 чалавек.

Нядаўна былі праведзены спаборніцтвы па лыжнаму спорту. Лепшыя вынікі паказалі студэнты Александровіч і Мечкоўскі на дыстанцыі 10 кілометраў, Марук і Белакурская на дыстанцыі 5 кілометраў.

Разыграна першынство факультэта па шахматах і шашках, у апошнія дні праведзены спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, намечана правесці сустрэчу па баскетболу паміж першым і другім курсамі.

Вялікай папулярнасцю ў студэнтаў хімічнага факультэта карыстаецца лыжны і стралковы спорт, плаванне. Гэтымі відамі спорту займаецца больш 40 чалавек на факультэце. У мінулым годзе хімічны факультэт заняў агульнае трэцяе месца у кругла-гадавой спартакіядзе студэнтаў універсітэта.

## У пошуках раяля...

На сённяшні вечар назначана рэпетыцыя харавога гуртка, таму мы рашылі знайсці харыстаў і адказнага за культурна-масавую работу ад комсамольскага бюро факультэта. Але зрабіць гэта аказалася не вельмі проста.

Лёлю Петрашкевіч мы засталі у пошуках раяля.

— У нас гэта звычайная справа,—растлумачыла яна.—У хімкорпусе няма свайго інструменту, а каб наш харавы гурток мог займацца, мы ваюем за раяль з таварышам Герасіменка. Наш танцавальны гурток ужо прывык танцаваць, як кажуць, «пад язык» і толькі перад самым вечарам на апошнюю рэпетыцыю неяк удаецца прывесці акампаніятара. З прычыны таго, што няма музыкі, рэпетыцыі часта зрываюцца, бывае мала добрых нумароў і студэнты скардзяцца на сумныя вечары.

Цяпер наш факультэт рыхтуецца разам з геафакам да вечара, прысвечанага Міжнароднаму жаночаму дню.

## На карысць Радзіме

Мы пацікавіліся не толькі жыццём студэнтаў хімфака, але і выкладчыкаў.



Каля 20 гадоў працуе ва універсітэце доктар хімічных навук Г. Л. Старобінец. У мінулым годзе ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю, прысвечаную вывучэнню натуральнага і сінтэтычнага каучука і гумы, атрыманай на аснове гэтых каучукаў. Гэтая дысертацыя набывае важнае практычнае значэнне, бо разліковым шляхам даказвае, што каучук і гума могуць быць адсарбентамі для раздзялення рэчываў.

— А над чым, Грыгорый Лазаравіч, вы працуеце цяпер?

— З групай супрацоўнікаў мы вывучаем фізіка-хімічныя уласцівасці нафты, працуем над ужываннем адсарбцыйных метадаў аналіза да вывучэння саставу нафты. Гэтая работа вядзецца у сувязі з намечаным у Беларусі будаўніцтвам двух нафтаперагонных заводаў.

Адначасова з навуковай работай Г. Л. Старобінец актыўна удзельнічае ў грамадскім жыцці універсітэта. Ён—старшыня профбюро факультэта, акрамя гэтага кіруе гуртком пры кафедры фізічнай хіміі.

## У выпускнікоў хімфака

Хімічны факультэт у гэтым годзе заканчвае 27 студэнтаў. Зараз у выпускнікоў адказная пара— праца над дыпломнымі работамі. Тэмы дыпломных работ хімікаў маюць навуковае і практычнае значэнне.

Непасрэдна практычнае значэнне для мотавелазавода мае дыпломная работа студэнткі М. Марчанка. Яна даследвае тэрмахімічную апрацоўку чыгуну, якая праводзіцца у мэтах павышэння устойлівасці супраць зношвання дэталяў матацыкла. Атрыманы ўжо добрыя вынікі на ўзорах дэталяў.

Цікавая работа ў выпускніцы Неакладнавай. Сваю работу яна прысвячае вывучэнню храматаграфічнага даследавання тарфяных воскаў, атрыманых у інстытуце торфа АН БССР. Над вывучэннем злучэнняў вышэйшага парадку метадам фізіка-хімічнага аналіза працуе дыпломнік Г. Арцюшэўскі.

Спачатку навучальнага года пачала працаваць над дыпломнай работай Л. Ясінская. Вынікі у яе вельмі добрыя. Яна атрымала два зыходных рэчывы пінакамфан і m-ментан. Работа яе мае важнае значэнне для вывучэння кінетычнага аутаакіслення гэтых вяшчэстваў.

Вынікі плённай працы пяцікурснікаў хімфака радуюць увесь універсітэт. Зімовую экзаменацыйную сесію яны здалі на «выдатна» за выключэннем двух чалавек, якія здалі на «выдатна» і «добра».

**Т. АРЛОВА, Г. НУЖКОВА, В. ЧЭПІКАЎ, В. КАНАВАЛЮК, Э. ЛУКАНСКАЯ, А. ЛАЗОЎСКАЯ.**

# АДКАЗНЫЯ ЗАДАЧЫ

*(З пасяджэння Вучонага совета)*

Нядауна адбылося пасяджэнне Вучонага совета універсітэта, прысвечанае вынікам вучэбнай работы за першы семестр 1955—1956 г. і навукова-даследчай работы за мінулы год.

Большасць выступаўшых у спрэчках па дакладах рэктара К. І. Лукашова і прарэктара па навуковай рабоце Г. А. Павецьева гаварылі аб новых задачах, якія паўсталі пасля XX з'езда КПСС перад калектывам універсітэта у справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і далейшага разгортвання навукова-даследчай работы.

Прафесар Т. Н. Годнеў большую частку свайго выступлення прысвяціў пытанню павышэння патрабаванняў да студэнтаў не толькі на заліках і экзаменах, але і на працягу усяго вучэбнага года.

— Атрымліваецца так, — гаворыць тав. Годнеў,—што многія студэнты увесь семестр займаюцца несістэматычна, урыўкамі, а затым пачынаецца штурмаўшчына. Трэба рашуча узмацніць кантроль за вучобай студэнтаў і пакончыць з падобнай практыкай.

Праф. Сеўчанка і доктар матэматычных навук Фёдараў у сваіх выступленнях рэзка крытыкавалі работнікаў гаспадарчай часткі універсітэта, якія на працягу дзевяці месяцаў не змаглі арганізаваць пераабсталяванне памяшкання былой друкарні у корпусе фізмата пад лабараторыі. І гэта у той час, калі студэнты фізіка-матэматычнага факультэта працуюць у выключна цесных лабараторыях.

Праф. Дарожкін гаварыў аб дрэнных умовах для работы на біёлага-глебавым факультэце. Тут для чатырох кафедр адведзен толькі адзін пакой. На кафедры сістэматыкі раслін няма нават добрага мікраскопа, што перашкаджае рабоце.

Прафесар Дарожкін унёс прапанову змяніць структуру і характар работы Вучоных советаў. Ён прапанаваў выбіраць намеснікамі старшыні Вучонага совета дэканаў з тым, каб узмацніць планаванне і кваліфікаваны кантроль за работай навуковых работнікаў.

Тт. Скапцоў і Шпірт у сваіх выступленнях гаварылі аб рабоце завочнага факультэта універсітэта, паколькі яго роля асабліва узрастае пасля XX з'езда КПСС. Факультэту неабходна наладзіць правядзенне кансультацый завочнікам на працягу усяго года, падняць патрабаванні да завочнікаў на узровень патрабаванняў стацыянарнага аддзялення.

— Набліжаецца 40-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі,—сказаў у сваім выступленні загадчык кафедры асноў марксізма-ленінізма І. І .Саладкоў.—Вучоныя кафедр грамадскіх навук, увесь калектыў нашага універсітэта павінны сустрэць гэтую знамянальную дату шырокім размахам творчай, даследчай работы.

# Павысіць дысцыпліну на лекцыях

Ала Чарнова дваццаць разоў абвяла у сшытку «Лекцыя па гісторыі беларускай мовы» (III курс аддзялення журналістыкі). Пачынае абводзіць дваццаць першы і «лекцыя» ператвараецца у вялізную чарнільную пляму. Са злосцю вырывае ліст і акуратна піша на ім некалькі запісак, якія праз хвіліну плывуць ва усе канцы аўдыторыі, адшукваючы свае каардынаты. Затым Ала дастае з сумкі атрыманае, мабыць, на перапынку пісьмо ці паварачваецца да Іны Барташук і пасля гэтага трэцякурснікі дарэмна прыкрываюць сваё правае або левае вуха: смех, шэпт сябровак заглушае голас выкладчыка.

— Канчай, Ала,—не вытрымлівае хтосьці з суседзяў.

— Ды што ты?—абураецца Чарнова.—Я-ж толькі пачынаю...

І, пачаўшы, яна звычайна не заканчвае да перапынку. Кажуць, што дрэнныя паводзіны Чарновай на лекцыях па гісторыі беларускай мовы, гісторыі беларускай літаратуры і інш. — вынік «ідэйнага» уплыву на яе Іны Барташук, якая вядома на трэцім курсе сваёй здзіўляючай безадказнасцю да вучобы.

А вось студэнтка гэтага-ж курса Ада Котава на лекцыях не піша запісак, не чытае, як Чарнова, пісем і амаль не размаўляе. Яна проста, сеўшы нават у першым радзе, ціхенька жуе сабе «залаты ключык» ці падобнае яму. Калі-ж хто-небудзь са студэнтаў папракне Аду, дык пачуе кароткае, але даволі выразнае: «Хам». Далейшую абарону Котавай вядзе Нэла Кавалёва, што звычайна сядзіць побач з ёй.

— Можа табе даць «залатога ключыка»?—абвярнуўшыся шэпча яна з такім выразам твару, што аднакурснік, які асмеліўся папракнуць Аду, з жахам адхіляецца:

— Не, не хачу!

Студэнтка II курса рускага аддзялення Эрыка Дайнека, напрыклад, любіць пачытаць у час лекцыі мастацкую літаратуру, а яе аднакурснікі Алег Шабельскі і Альфрэд Майхровіч не супраць у гэты-ж час гучна пагутарыць і пасмяяцца.

Не вядзе канспектаў і перашкаджае працаваць іншым у час лекцый студэнт першага курса аддз. геалогіі Л. Бурцаў. Першакурснікі гэтага аддзялення О. Лукашэвіч і Ю. Булкін звязаны паміж сабой «вузамі моцнай дружбы» і у час заняткаў па французскай мове выручаюць адзін аднаго падказваннем.

Дрэнная дысцыпліна ў многіх студэнтаў III курса аддзялення геаграфіі і аддзялення геалогіі на агульных лекцыях па палітэканоміі. Толькі некалькі чалавек вядуць канспекты. Астатнія, згуртаваўшыся за апошнімі сталамі, шумяць, ажыўлена размаўляюць. Выкладчык т. Т. А. Базылёў часта вымушан спыняць чытанне лекцыі і супакойваць такіх студэнтаў, як Н. Рымдэйка, Н. Стругач, А. Меяроўскі. Не лепш праходзяць лекцыі і па педагогіцы на III курсе геолага-геаграфічнага факультэта.

Комсамольскім арганізацыям філалагічнага, геолага-геаграфічнага і іншых факультэтаў патрэбна, не адкладаючы справу надалей, узняць пытанне аб дысцыпліне студэнтаў, павесці рашучую барацьбу з тымі, хто не працуе на лекцыях сам і перашкаджае працаваць другім.

**В. УЛАДЗІМІРАЎ.**

ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ

# ЦІ ПАЧУЕМ МЫ РАДЫЁПЕРАДАЧЫ?

У мінулым годзе для студэнтаў, што пражываюць у інтэрнатах па Бабруйскай вуліцы, былі наладжаны цікавыя радыёперадачы з універсітэцкага радыёвузла: трансліраваліся канцэрты мастацкай самадзейнасці, перадаваліся інфармацыі аб універсітэцкім жыцці, сатырычная газета «Мыйдадыр» і інш. Перадачы карысталіся вялікім поспехам.

— Нарэшце не толькі танцавальную музыку перадаюць з нашага радыёвузла,—гаварылі студэнты.

Але дарэмна. У пачатку бягучага навучальнага года радыё зноў змоўкла і перадачы сталі абмяжоўвацца танцавальнай музыкай на вечарах адпачынку, ды калі-ні-калі голас універсітэцкага радыё можна было пачуць у вучэбных карпусах. Невядома, па якой прычыне здарылася гэтае непаразуменне, але ранейшую работу радыёвузла неабходна аднавіць у найкарацейшы тэрмін.

**М. АНЦІПАЎ,**
**А. ІЎЧЫНКАЎ,**
**В. ХМЯЛЬНІЦКІ.**

*АД РЭДАКЦЫІ.* Як паведаміў нашаму супрацоўніку намеснік рэдактара радыёкамітэта універсітэта І. Чыгрынаў, указаныя у пісьме недахопы у рабоце радыёкамітэта ёсць. У цяперашні час няма лініі ад радыёвузла да інтэрнатаў (корпус «А» і «Б»). Наяўная да гэтага часу лінія перанесена гарадской радыёсеткай. Супрацоўнікі радыёкамітэта БДУ неаднаразова звярталіся да прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай часткі тав. Бярэзіна і старшыні прафкома тав. Марчанка з просьбай правесці новую лінію, але пэўнага адказу не атрымалі.

Рэдакцыя спадзяецца, што пытанне аб нармальнай рабоце універсітэцкага радыёкамітэта будзе у хуткім часе вырашана.




## ДЗЕВЯТЫ ВАЛ

(Амаль па Айвазоўскаму)

Князева, студэнтка IV курса аддзялення журналістыкі, дзевятую сесію атрымлівае двойкі.



*Раскинулось море широко,*
*Но плыть ей теперь недалеко.*
*Ждёт Князеву скоро расплата,*
*Пред грозным лицом ректората.*

## ДВАНАЦЦАЦЬ НА СТУЛЕ

У пакоі № 4 інтэрната па вуліцы Няміга на 12 чалавек студэнтаў адзін стул.



Адзін на усіх,
Усе на аднаго.

## *БАЛАНСІРОЎКА БУХГАЛТЭРЫІ*

Супрацоўнікі бухгалтэрыі часта у рабочы час ходзяць у кіно.






Из кассы Быстрик
Смотался быстро
(Собравшись духом
вслед за главбухом).
Ну и девчатам
Тут не сидится —
Умчались вслед.
А что у кассы сейчас
творится—
Им дела нет.

## „Дзе радыёла?"

Дружа Вожык!

Уяві наступнае:

— Вечар. Па калідоры трэцяга паверху інтэрната студэнтаў па вуліцы Бабруйскай (корпус «А») весела ідуць два студэнты.

— Ведаеш, Толя, я вось папрацую добра днём—неяк асабліва лёгка і радасна вечарам,—гаворыць адзін з іх сябру, і дадае, адчыняючы пакой адпачынку: Дык можа паслухаем што-небудзь лірычнае?

У пакоі адпачынку толькі загадчык яго, член студсовета Тамара Пармон.

— Скажыце, калі ласка,—звяртаецца да яе адзін з зайшоўшых,—дзе радыёла з гэтага пакою?

— У 53-м,—чуецца кароткі адказ.

Наведвальнікі выходзяць і адразу іх увагу прыцягвае гучная музыка, што нясецца з канца калідора, з 53-га. Накіроўваюцца туды, заглядаюць у выпадкова адчыненыя дзверы і адступаюць ад здзіўлення: у пакоі спрытна танцуе факстрот з нейкай дзяўчынай старшыня студсовета інтэрната Васіль Шыцік.

— Так, брат,—гаворыць студэнт свайму таварышу, — весяліцца старшыня у сваім пакоі, а што другія студэнты хочуць паслухаць музыку—забыўся.

Хлопцы вяртаюцца у сваі пакоі.

Дрэнна працуе пакой адпачынку інтэрната па вуліцы Бабруйскай. У апошні час тут чамусьці адсутнічаюць газеты, не прызначаецца дзяжурны і рэдка-рэдка прынясе сюды радыёлу з свайго пакоя старшыня студсовета Вася Шыцік.

Дык ці не дапаможаш ты, дружа Вожык, Шыціку часцей прыносіць у пакой адпачынку радыёлу, а Тамары Пармон лепш спраўляцца са сваімі абавязкамі?

**А. ВАСІЛЬКОЎ.**

## АБ „ВЯДОМЫМ" ЮРЫСЦЕ БРОЎКУ-ПЛЯВАКУ

Броўка—студэнт юрыдычнага факультэта — плюнуў у твар гардробшчыцы за тое, што яна не выдала яму без чаргі верхнюю вопратку.



*Вы не слыхали*
*об этом*
*дебоше?*
*Бровке*
*не выдали*
*вмиг*
*калоши,*
*Не посчитавшись*
*совсем*
*при этом,*
*Что*
*помпадурчик—*
*сынок поэта.*
*В злобе великой*
*взъелось*
*дрянцо*
*И харкнуло*
*женщине*
*прямо*
*в лицо.*
*Были мужчины там.*
*Больше чем*
*странно:*
*Не проучили*
*они хулигана.*

## Унушальныя паказчыкі

За 10 месяцаў 1955 года студэнтамі універсітэта у інтэрнатах і вучэбных карпусах было разбіта 948 кв. метраў шкла, паламана 750 стулаў, 200 ложкаў.

Думаецца, што кіраўнікам грамадскіх арганізацый ёсць аб чым падумаць у сваёй рабоце.



# ДА АБМЕНУ КОМСАМОЛЬСКІХ ДАКУМЕНТАЎ

У Беларускім дзяржауным універсітэце імя В. І. Леніна з 15 сакавіка будзе праходзіць абмен комсамольскіх дакументау.

Адказным за учот на факультэтах, сакратарам комсамольскіх курсавых бюро і групоргам неабходна за дзень да абмену зверыць у Ленінскім РК ЛКСМБ спіскі комсамольцау групы, курса, наяунасць фотакартак.

Абмен комсамольскіх дакументау будзе праходзіць строга па графіку у вызначаныя для кожнай групы гадзіны.

**КАМІТЭТ КОМСАМОЛА.**

## ГРАФІК

### АБМЕНУ КОМСАМОЛЬСКІХ ДАКУМЕНТАЎ У КОМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ В. І. ЛЕНІНА.

### *ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ*

| | | |
|---|---|---|
| **15 сакавіка (чацвер)** | | |
| 1 курс аддз. бел. мовы і літ. | 1,2 гр. | з 9-00 да 12-30 |
| **16 сакавіка (пятніца)** | | |
| 1 курс аддз. рус. мовы і літ. | 1,2 гр. | з 9-00 да 11-00 |
| 1 курс аддз. журналістыкі | | з 11-00 да 12-30 |
| **17 сакавіка (субота)** | | |
| 2 курс аддз. бел. мовы і літ. | 1 гр. | з 9-00 да 10-00 |
| | 2 гр. | з 10-00 да 11-00 |
| | 3 гр. | з 11-00 да 12-45 |
| **19 сакавіка (панядзелак)** | | |
| 2 курс. аддз. рус. мовы і літ. | 1 гр. | з 9-00 да 10-30 |
| | 2 гр. | з 10-30 да 11-30 |
| | 3 гр. | з 11-30 да 13-00 |
| **20 сакавіка (аўторак)** | | |
| 2 курс аддз. журналістыкі | 1 гр. | з 9-00 да 10-30 |
| | 2 гр. | з 10-30 да 12-30 |
| **21 сакавіка (серада)** | | |
| 3 курс аддз. бел мовы і літ. | | з 9-00 да 12-00 |
| **22 сакавіка (чацвер)** | | |
| 3 курс аддз. рус. мовы і літ. | 1 гр. | з 9-00 да 10-00 |
| | 2 гр. | з 10-00 да 11-00 |
| 3 курс аддз. журналістыкі | 1 гр. | з 11-00 да 12-00 |
| | 2 гр. | з 12-00 да 13-00 |
| **23 сакавіка (пятніца)** | | |
| 4 курс аддз. рус. мовы і літ. | 1 гр. | з 9-00 да 10-30 |
| | 2 гр. | з 10-30 да 11-40 |
| 4 курс аддз. бел. мовы і літ. | | з 11-40 да 13-00 |
| **24 сакавіка (субота)** | | |
| 4 курс аддз. журналістыкі | | з 9-00 да 11-00 |
| 5 курс аддз. журналістыкі | | з 11-00 да 13-00 |
| **26 сакавіка (панядзелак)** | | |
| 5 курс аддз. бел мовы і літ. | | з 9-00 да 11-30 |
| 5 курс аддз. рус. мовы і літ. | | з 11-30 да 13-00 |

### *ГЕОЛАГА-ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ*

| | | |
|---|---|---|
| **15 сакавіка (чацвер)** | | |
| 2 курс аддз. геаграфіі | 1 гр. | з 14-10 да 15-30 |
| | 2 гр. | з 15-30 да 17-00 |
| **16 сакавіка (пятніца)** | | |
| 1 курс аддз. геаграфіі | 1 гр. | з 14-10 да 15-30 |
| | 2 гр. | з 15-30 да 17-00 |
| 3 курс аддз. геаграфіі | | з 17-00 да 18-00 |
| **17 сакавіка (субота)** | | |
| 4 курс аддз. геаграфіі | | з 14-10 да 15-30 |
| 1 курс аддз. геалогіі | | з 15-30 да 17-30 |
| **21 сакавіка (серада)** | | |
| 5 курс аддз. геаграфіі | | з 12-00 да 13-00 |
| 2 курс аддз. геалогіі | 1,3 падгр. | з 14-10 да 15-30 |
| 3 курс аддз. геалогіі | 1,2,3 падгр. | з 15-30 да 18-00 |
| **29 сакавіка (чацвер)** | | |
| 5 курс аддз. геалогіі | 1 гр. | з 14-00 да 15-00 |
| | 2 гр. | з 15-00 да 16-30 |
| 3 курс аддз. геалогіі | 4 падгр. | з 16-30 да 18-00 |
| **30 сакавіка (пятніца)** | | |
| 2 курс аддз. геалогіі | 2,4 падгр. | з 14-00 да 15-30 |
| 4 курс аддз. геалогіі | 1,2,4 падгр. | з 15-30 да 18-00 |
| **31 сакавіка (субота)** | | |
| 4 курс аддз. геалогіі | 3 падгр. | з 14-00 да 15-00 |

### *ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ*

| | | |
|---|---|---|
| **19 сакавіка (панядзелак)** | | |
| 4 курс | 1 гр. | з 14-10 да 15-30 |
| | 2 гр. | з 15-30 да 17-00 |
| | 3 гр. | з 17-00 да 18-00 |
| **22 сакавіка (чацвер)** | | |
| 1 курс | 1 гр. | з 14-10 да 15-30 |
| | 2 гр. | з 15 30 да 17-00 |
| 2 курс гр. дзяучат | | з 17-00 да 18-00 |
| **23 сакавіка (пятніца)** | | |
| 2 курс | гр. мужчын | з 14-00 да 15-30 |
| **24 сакавіка (субота)** | | |
| 3 курс | 1 гр. | з 14-10 да 15-30 |
| | 2 гр. | з 15-30 да 17-00 |
| | 3 гр. | з 17-00 да 18-00 |
| **28 сакавіка (серада)** | | |
| 5 курс | 1 гр. | з 14-30 да 16-00 |
| | 2 гр. | з 16-00 да 17-30 |

### *БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ*

| | | |
|---|---|---|
| **4 красавіка (серада)** | | |
| 4 курс аддз. біялогіі | 1 гр. | з 9-00 да 11-00 |
| | 2 гр. | з 17-00 да 18-00 |
| **5 красавіка (чацвер)** | | |
| 2 курс аддз. біялогіі | 1 гр. | з 14-10 да 15-30 |
| | 2 гр. | з 15-30 да 16-30 |
| 5 курс аддз. біялогіі | | з 9-00 да 11-00 |
| 5 курс глебавага аддз. | | з 11-00 да 12-30 |
| 3 курс глебавага аддз. | | з 16-30 да 17-30 |
| **12 красавіка (чацвер)** | | |
| 3 курс аддз. біялогіі гр. дзяучат | | з 9-00 да 10-00 |
| 4 курс глебавага аддз. | | з 17-00 да 18-00 |
| **14 красавіка (субота)** | | |
| 1 курс аддз. біялогіі | 1 гр. | з 9-00 да 11-00 |
| | 2 гр. | з 16-10 да 17-00 |
| 3 курс аддз. біялогіі | | з 17-00 да 18-00 |

### *ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ*

| | | |
|---|---|---|
| **27 сакавіка (аўторак)** | | |
| 3 курс | 1 гр. | з 9-00 да 10-00 |
| | 2 гр. | з 10-00 да 11-00 |
| | 3 гр. | з 11-00 да 12-30 |
| **28 сакавіка (серада)** | | |
| 1 курс | 1 гр. | з 9-00 да 10-30 |
| | 2 гр. | з 10-30 да 12-00 |
| **29 сакавіка (чацвер)** | | |
| 4 курс | гр. мужчын | з 9-30 да 13-00 |
| **30 сакавіка (пятніца)** | | |
| 4 курс | гр. дзяучат | з 9-30 да 12-00 |
| **31 сакавіка (субота)** | | |
| 2 курс | гр. мужчын | з 9-30 да 12-00 |
| **3 красавіка (аўторак)** | | |
| 2 курс | гр. дзяучат | з 9-30 да 12-00 |

### *ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ*

| | | |
|---|---|---|
| **31 сакавіка (субота)** | | |
| 2 курс | 1, 2, 6 гр. | з 15-00 да 16-30 |
| | 7, 8, гр. | з 16-30 да 18-00 |
| **4 красавіка (серада)** | | |
| 5 курс | | з 11-00 да 12-30 |
| **6 красавіка (пятніца)** | | |
| 3 курс | гр. дзяучат | з 9-30 да 11-30 |
| 4 курс | 1, 2, 4 гр. | з 14-10 да 15-00 |
| 2 курс | 3, 4, 5, гр. | з 15-00 да 18-00 |
| **7 красавіка (субота)** | | |
| 4 курс | 3 гр. | з 9-00 да 10-00 |
| 1 курс | | з 14-10 да 17-30 |
| 3 курс | гр. мужчын | з 17-30 да 18-00 |

### *ФІЗІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ*

**Аддзяленне фізікі**

| | | |
|---|---|---|
| **16 сакавіка (пятніца)** | | |
| 5 курс | | з 15-30 да 18-00 |
| **26 сакавіка (панядзелак)** | | |
| 1 курс | 1 гр. | з 14-10 да 15-00 |
| | 2 гр. | з 15-,00 да 16-00 |
| | 3 гр. | з 16-00 да 17-00 |
| | 4 гр. | з 17-00 да 18-00 |
| **2 красавіка (панядзелак)** | | |
| 3 курс | гр. мужчын. | з 16-10 да 17-45 |
| **4 красавіка (серада)** | | |
| 2 курс | 1 гр. | з 14-10 да 15-00 |
| | 2 гр. | з 15-00 да 16-00 |
| | 3 гр. | з 16-00 да 17-30 |
| **7 красавіка (субота)** | | |
| 3 курс | гр. дзяучат | з 10-00 да 11-30 |
| **12 красавіка (чацвер)** | | |
| 4 курс | | з 14-10 да 17-00 |

**Аддзяленне матэматыкі**

| | | |
|---|---|---|
| **21 сакавіка (серада)** | | |
| 5 курс | | з 12-00 да 13-00 |
| **9 красавіка (панядзелак)** | | |
| 4 курс | 1 гр. | з 9-00 да 10-30 |
| | 2 гр. | з 10-30 да 12-30 |
| 1 курс | 1 гр. | з 14-10 да 15-00 |
| | 2 гр. | з 15-00 да 16-00 |
| | 3 гр. | з 16-00 да 17-00 |
| | 4 гр. | з 17-00 да 18-00 |
| **11 красавіка (серада)** | | |
| 3 курс | 1 гр. | з 14-10 да 15-00 |
| | 2 гр. | з 15-00 да 16-00 |
| | 3 гр. | з 16-00 да 17-30 |
| **13 красавіка (пятніца)** | | |
| 2 курс | 1 гр. | з 9-30 да 11-00 |
| | 2 гр. | з 14-10 да 15-00 |
| | 3 гр. | з 15-00 да 16-00 |
| | 4 гр. | з 16-00 да 17-30 |

### *АСПІРАНТЫ*

**2 красавіка (панядзелак)**

з 9-00 да 13-00

### *СУПРАЦОЎНІКІ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЙ ЧАСТКІ*

**10 красавіка (аўторак)**

з 9-30 да 11-00

### *ВЫДАВЕЦТВА*

**10 красавіка (аўторак)**

з 11-00 да 12-00

# *ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ*

## БОЛЬШ УВАГІ РАЗВІЦЦЮ ФІЗКУЛЬТУРЫ І СПОРТУ

18 лютага адбылася расшыраная нарада актывістау ДТСААФ і совета ДСТ «Буравеснік» універсітэта. Удзельнікі нарады заслухалі і абмеркавалі даклады тав. Драгуна (ДТСААФ) і тав. Садоускага (совет ДСТ) аб рабоце, праведзенай гэтымі арганізацыямі за першае поугоддзе 1955—56 навучальнага года.

Работа у ДТСААФ, як адзначыу дакладчык, знаходзіцца на нізкім узроуні. Ва універсітэце фактычна працуюць толькі аутагурток і стралковая секцыя. У такіх гуртках, як фатаграфічным, матацыклетным, радыё і парашутным,—да гэтага часу не прыступілі да работы. Жадаючых займацца у мотагуртку многа, але няма кірауніка.

Некалькі лепш арганізавана работа советам ДСТ «Буравеснік». Ва універсітэце рэгулярна працуюць 20 секцый па розных відах спорту. Добра пастаулена наглядная агітацыя.

Рабоце спартыуных секцый значна перашкаджае і тое, што у нас усё яшчэ малыя базы для рэгулярных заняткау у секцыях барацьбы і лыжнай. У футбалістау няма буцау, мячоу, у веласіпедыстау—веласіпедау. Закрыта хакейная секцыя. Аб такім становішчы спрау ведаюць і прафком, і камітэт комсамола. Але мер ніякіх не прымаецца. Задачы перад калектывам вялікія. Трэба у гэтым годзе падрыхтаваць аднаго майстра спорту, 16 першаразраднікау, 75 спартсменау другога разраду і 230—трэцяга.

Пасля справаздачных дакладау разгарнуліся спрэчкі. Першым выступіу тав. Сухау.

— Павярхоуна глядзяць кірауніkі комсамольскіх арганізацый факультэтау на абаронна-масавую работу,—сказау выступаючы.

— На філфаку у мінулым годзе Філістовіч працавау дрэнна. Але яго чамусьці выбралі старшынёй факультэцкага бюро ДТСААФ і у гэтым годзе. У выніку такога «кірауніцтва» у стралковай секцыі універсітэта няма ніводнага студэнта-філолага.

Далей тав. Сухау гаворыць аб тым, што у арганізацыі ДТСААФ да гэтага часу не наладжан улік. У гэтай справе патрэбна дапамога камітэта комсамола. Але адказны за абаронна-масавую работу тав. Тачыцкі толькі прысутнічае на розных пасяджэннях і нарадах, дае парады, а практычнай дапамогі не аказвае.

— Комсамольскае бюро,—сказау студэнт Ларчанка, адказны за спартыуную работу на філфаку,—па некалькі разоу заслухоувала нас. Прымалася рашэнне. Праходзіу час—аб ім забываліся.

Студэнт гістарычнага факультэта Ціток гаварыу аб тым, што спартыунае бюро і адказныя ад комсамольскага бюро зусім не займаюцца пытаннямі уцягнення у розныя секцыі першакурснікау.

— Лепшыя спартсмены старшых курсау заканчваюць універсітэт,—сказау ён.—Неабходна цяпер думаць аб поунацэннай замене іх.

Аб значным паляпшэнні спартыунай работы гаварыу загадчык кафедры фізвыхавання тав. Маркау. Ён адзначыу нездавальняючую работу комсамольскіх бюро факультэтау (філфак, фізмат, біяфак) па нагляднай прапагандзе фізкультуры і спорту. На гэтых факультэтах не вядзецца уцягненне у спартыунае таварыства новых членау. Не выканан план па узносах. Тав. Маркау таксама паведаміў, што калі не будуць праведзены на факультэтах спаборніцтвы па лыжах, шахматах і іншых відах спорту, факультэт не дапускаецца да спаборніцтвау на першынство універсітэта. А такія спаборніцтвы праводзяцца марудна.

— Многія таварышы выбраны у факультэцкія бюро ДСТ «Буравеснік» упершыню. Работы яны не ведаюць. Вучыць іх—задача не толькі нізавога совета, але і камітэта комсамола універсітэта. Аднак адказны за спартыуную работу ад камітэта комсамола тав. Новік адарвауся ад фізкультурнай работы, не дапамагае разумна наладзіць работу на факультэтах.

Удзельнікі нарады прынялі пастанову, накіраваную на значнае паляпшэнне абаронна-спартыунай работы.

**Н. БАНДАРЭНКА.**

## Ніжэй сваіх магчымасцей

У нядзелю 26 лютага у парку Чэлюскінцау адбыліся зімовыя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы ДСТ «Буравеснік» горада Мінска.

У бегу на 100 метрау, скачках у вышыню і даужыню, штурханні ядра і кіданні молата прынялі удзел і спартсмены нашага універсітэта.

Найбольш паспяховым у спаборніцтвах было выступленне нашых спрынтэрау. У забегах на 100 метрау для мужчын бегуны БДУ занялі агульнае першае месца. Пераможцам тут выйшау студэнт Ціток, які паказау час—12,0 секунд. На другім месцы аказауся Гулякевіч. Яго вынік—12,1 секунды.

Значна горш выступілі жанчыны. У бегу на 100 метрау лепшая універсітэцкая спартсменка Лаурыновіч здолела заняць толькі чацвертае месца.

Нядрэнныя вынікі у спаборніцтвах паказалі студэнты Л. Станішэускі, які заняу першае месца па скачках у даужыню з малога разбегу (6 м 09 см), Патапава, якая заваявала трэцяе месца сярод жанчын па скачках у вышыню з вынікам 135 сантыметрау, Майсейчук, які кінуу молат на 43 метра 60 сантыметрау, што перавышае норму другога разраду.

Добрыя паказчыкі былі у жанчын па штурханню ядра і у мужчын па скачках у вышыню з разбегу.

Але у агульным заліку калектыу універсітэта выступіу значна ніжэй сваіх магчымасцей—ён заняу трэцяе агульнакаманднае месца. Вельмі дрэнныя вынікі паказалі жанчыны па скачках у даужыню, мужчыны—па штурханню ядра. Напрыклад, па штурханню ядра сярод мужчын выстаулена недастатковая колькасць удзельнікау, ды і тыя, што прынялі удзел у спаборніцтвах, не змаглі штурхануць ядро далей 10 метрау.

Вядома, кафедра фізвыхавання павінна улічыць усе недахопы, удзяліць яшчэ больш увагі такім відам спорту, як штурханне ядра, скачкі.

Час не чакае, і аб гэтым трэба падумаць з усёй сур'ёзнасцю цяпер, перад хуткім наступленнем вясенне-летняга спартыунага сезону.

**Э. КАРПАЧОЎ.**

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой62, тэл. 2-07-19

АТ 02940 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 283. Тыраж 2000.